CORE Metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
Provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

Васіль СТАРЫЧОНАК

# “ЗАПАЛОНЕН Я ПЕСНЯЙ ЗЯМЛІ...”: МЕТАФАРЫ ГУКАВОГА ТЫПУ

Метафарычныя пераасэнсаванні гукавога тыпу ў асноўным характарызуюцца антрапамарфізмам і звычайна ажыццяўляюцца ў кірунку ад гукаў чалавека на падобныя ў нечым шум дрэў і ветру, гул грому, журчанне вады, усплёск хваляў, спеў і шчабятанне птушак. Акрамя засведчаных у літаратурнай мове полісемантаў *галашэнне, гамонка, гоман, голас, енк, літанне, перашэпты, рогат, спеў, стогн, уздых, уздыханне, усхліп*, у творах мастацкай літаратуры выкарыстоўваюцца назоўнікі *балбатня*, *гамана, гуканне, дыспут, малебен, маленне, малітва, плач, прычытанне, размова, трызненне*. Распаўсюджаная ў літаратурнай мове анімістычная мадэль ‘гукі жывёл → гукі людзей’ *(шчабятанне, шчэбет, роў)* пашыраецца за кошт аказіянальных ЛСВ полісемантаў *іржанне, брэх*. Птушыны спеў, шум ветру, шэлест лістоты і інш. у многіх выпадках асацыіруюцца з меладычнасцю і музыкальнасцю гукаў, выкананнем пэўнай мелодыі, песні, музычнага твора *(гімн, калыханка, канцэрт, найгрыш, накцюрн, напеў, нота, рэквіем, сола, фантазія)*. Тэматычная скіраванасць першасных ЛСВ полісемантаў і іх семантычнае развіццё залежыць ад той ці іншай ступені праяўлення гучання. Так, вялікая сіла, працягласць, узмоцненасць гучання гукаў жывой прыроды атаясамліваюцца з *авацыяй, кананадай, сваркай, гармідарам*, а ціхія, не зусім выразныя гукі – з *казкай, роздумам, веча*.

**Авацыя** **1**.’шумлівы лістапад’. *Лістабой аглушае папар раскацістай хваляй асенніх авацый.* (Э. Акулін) **2.** ‘шум дажджу’. *Пад сто фантазій сівера І пад дажджу авацыі Кахання вочы сінія Мяне ніякавацілі.* (В. Стрыжак)

**Балбатня** ‘птушыны спеў’. *Калі мы сустрэліся з табой, І вясельных чарак перазвон Чулі ў салаўінай балбатні.* (Х. Жычка**)**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Брэх** ‘гукі, якія ўтвараюцца пры стральбе з кулямёта, аўтамата і з іншай зброі’. *І выйдзем дружна ротамі, Як будзе шчэ іспыт: І брэхі кулямётавы, І цоканне капыт.* (Ю. Лявонны) *Ацалелыя яблыні Помняць звяглы Кулямётаў зганчэлы брэх.* (Р. Барадулін) *Мы ідзем праз рэвальверны брэх, Як паэт калісьці гаварыў.* (Х. Жычка)

**Веча 1**. ‘шэпт дрэў’. *Па-над цёплай лугавінай Ноч запальвае кастры. Старажытных соснаў веча.* (Я. Янішчыц) *Апошні раз удзячна гляну На заінелую паляну, дзе дрэў сівых аціхла веча І ярка полымя трапеча.* (У. Скарынкін) *Жыў кравец, дзе сосен веча Ветрам буйным разгукана.* (М. Мятліцкі) *О сосны, хто прыдумаў вам Майданак?! Хто цвёрдаю рукой падрэзаў жылы, Жывіцу цягне з вас — жывую сілу?.. Знайду! І перад вашым, сосны, вечам, На тым судзе — лясным і чалавечым — Спытаю гнеўна — хай адказ трымае.* (В. Зуёнак) **2**. ‘птушыны гоман’. *Як збіраліся птушкі у вырай На сваім шматгалосым вечы, Зазвінеў кайданамі ў Сібір ён [прадзед] З Беларусі — навечна.* (С. Блатун) *Напэўна, свой край векавечны Нялёгка бус-лам пакідаць. Птушынае ціхае веча Праводзяць, па ўсім тут відаць.* (В. Жуковіч)

**Гаварок** ‘ціхая завыванне ў завіруху’. *Я ў маленстве любіў завіруху, Забіраўся ва ўтульны куток, Пазіраў навакола і слухаў Чыстазвонны яе га-варок.* (М. Пазнякоў)

**Гамана** ‘перарывісты шум, гул (пра шчабятанне птушак, журчанне вады, шум дрэў)’. *Яшчэ сонца не ўзыдзе, а над будкай усчынаюць ужо сваю гаману птушкі.* (Р. Мурашка) *Гамана сястрыц-зязюль.* (Я. Янішчыц) *Гамана птушыная змаўкае.* (А. Русецкі) *Навокал ціха, толькі чуваць, як плюскоча рэчка ў берагах, як цурчыць яе адвечная, мілая для сэрца гамана.* (М. Ткачоў) *Дрэвы скончылі гаману.* (Л. Філімонава) *Зноў ад пушчанскай гаманы Вяртаюся к табе, шчаслівы.* (К. Камейша) *Мяне дагнала клёнаў гамана.* (У. Марук) *Калышуцца за сінім шклом галіны І чутна лёгкіх ценяў гамана.* (С. Гаўрусёў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Гандаль** ‘птушыны шум, шчэбет’. *А на узгорку лысым гандаль вераб’іны.* (І. Лосік

**Гармідар** ‘птушыны ці пчаліны шум, звон’. *Гармідар птушак у гаі хавае гук шчымлівай скрухі.* (В. Тарас) *Над востравам у асмужаным туманам небе звінелі жаўранкі, а ў бярозавым гаі стаяў грачыны гармідар.* (А. Асіпенка) *На пасецы ўсё ад звону гуло. Стаяў гармідар вясёлы.* (Г. Бураўкін)

**Гімн** ‘**1.** птушыны спеў’. *Гімн складаюць пеўні сонцу і вясне.* (В. Гарановіч) *Ранку гімн спявае пеўнік.* (М. Скобла) *Спявае птах срэбна гімн светламу небу свайму.* (А Вярцінскі) *Звіняць шчабятушкі — Свой гімн пяюць птушкі.* (Я. Купала) *Птушкі! Надарыўся міг весялосці — распавяшчайце ўрачыстыя гімны.* (М. Дукса) *Салавей прапяе Урачыстыя гімны.* (А. Сербантовіч) **2**. ‘шэпт, шум дрэў, траў і пад’. *Шумець век векам будуць хвоі І гімны славы вам складаць.* (Я. Колас) *П’яную песню, гімн чыстаму каханню заспявалі званчэй чараты.* (Р. Мурашка) *На ўзлессі сосны строга хмураць бровы. Суровы гімн пяе зямля мая.* (Л. Генію ш) *Весні гімн вадаспада Стаў як вешчая рада.* (М. Віняцкі)

**Гуканне** ‘кукарэканне’. *Я прахапіўся ад гукання пеўняў.* (Ф. Баторын)

**Дыспут** **1**. ‘шапаценне, шум лістоты’. *Шумны дыспут лісця.* (М. Кусянкоў) **2**. ‘пачарговы брэх сабак’. *Дыспут вечны сабакі Вядуць дваравіта.* (Р. Барадулін)

**Іржанне** ‘лязг, скрогат’. *Цемру жудаснай вайны, Крыві, атрутных газаў і фугасаў, Іржання й кашалю картавых танкаў... Усю тую цемру Прарэзала святлом нязмерным веры.* (Я. Купала)

**Казка** **1**. ‘ледзь чутнае шапаценне раслін’. *Ціха калосікі баялі казкі.* (А. Гурло) **2.** ‘журчанне вады’. *Цудоўную казку гамоніць рака.* (Я. Журба)

**Калыханка** ‘шум ветру, журчанне вады і пад.’ *Дарэмна пяеш калыханку, зіма.* (А. Вялюгін) *З прыродай жорсткай біўся [чалавек]з веку ў век Пад Прыпяці глухую калыханку.* (У. Верамейчык)

**Кананада** **1**. ‘гучны і працяглы спеў птушак’. *Ціха! Гучыць кананада Птушыных галасоў...* (М. Башлакоў) **2**. ‘гул, грукат льдзін у час крыгалому’.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Туман туліўся нізка да затокі, Дзе кананадай грукалі ільды.* (А. Звонак) **3**. ‘гром, моцны гул’. *Громы з перунамі вар’яцелі, зліваючыся ў адну суцэльную кананаду.* (А. Якімовіч)

**Канцэрт 1**. ‘птушыны спеў’. *І салаўі па вечарах Даюць свае канцэрты.* (М. Смагаровіч) *Птушыны канцэрт не сціхае ў лугах.* (М. Лупсякоў) *Абганяючы адзін аднаго, крылатыя лясныя жыхары спяшаліся на свой птушыны канцэрт.* **(**Л. Вірня) **2.**’кваканне жаб’. *Жабы ўжо ажылі і спраўлялі тут свае вясёлыя канцэрты.* (А. Якімовіч) *Дождж як бы сціх, выразней сталі чутны жабіныя канцэрты, а потым адразу пракаціліся па небе грымоты.* (М, Лупсякоў) **3.**’завыванне ветру’. *На кантрабасах дрэў, на флейтах завірухі Такі канцэрт наладзілі вятры, Што нават снег, каб рэквіем паслухаць, Як белы слуп, насіўся угары.* (А. Сербантовіч)

**Кашаль** ‘лязг, скрогат’*... Іржання й кашалю картавых танкаў... Прарэзала святлом нязмерным веры.* (Я. Купала)

**Літанне ‘**спеў птушак’. *Яшчэ больш гучна, яшчэ з большым натхненнем правяць салаўі раннія літанні.* (Я. Колас)

**Малебен** ‘спеў цецерука’. *І сядзе на елцы высокай касач, свае адчытае малебны...* (У. Дубоўка)

**Маленне 1.** ‘шэлест лістоты’. *“Зрабіце мне хоць крышачку дабра, — прасіла груша-дзічка пры дарозе. — Я вам аддзячу, я свой чэзлы плод Ўзрашчу вялікім, сакаўным і жоўтым”... Ды каторы год Праходзяць, праязджаюць людзі міма, І трушчыцца пад колам і нагой Нікому не патрэбнае маленне.* (Г. Каржанеўская) **2**. ‘роў жывёл’. *Трубяць алені ў шлюбным маленні, І цецярук-лапатун балбоча.* (Р. Барадулін) 3. ‘гукі, што ўтвараюцца звонам’. *У вячэрнім маленні званоў — Учарашніх вякоў перазовы.* (Л. Пранчак)

**Малітва** ‘шэлест лістоты’. *Сосны і вязы, дубы і асіны Вокала возера вартай пасталі, Долу ківаюць паклоны нямыя, Небу малітву таемную тварыць.* (Я. Купала)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Маналог** ‘шум дажджу’. *Барвовая лістота Пад старым бацькавым клёнам Тоіць у сабе бадзёрыя маналогі летніх ліўняў, Вясёлыя песні вятроў.* (З. Марозаў)

**Марзянка** ‘гулкае стуканне кропель дажджу’. *За чорным, як сажа, акном Дождж асенні шуміць без супыну. Услухоўваюся і чытаю на слых Гулкіх кропель марзянкі па блясе.* (Н. Гілевіч)

**Мелодыя 1.** ‘шум, шопат дрэў, ветру і пад.’ *А дзе мая празрыстая крыніца? Дзе ціхая мелодыя лясоў?* (Я. Янішчыц) *А я свой абвостраны слых Частую мелодыяй пушчы.* (У. Васько) *Лісцёвая замець Нашэпча мелодыю восеньскіх дрэў.* (М. Башлакоў) *І панёс ён гармонік з сабою ў абдымку Пад мелодыю сцюжнага ветру.* (Я. Хвалей) *Даждлівая, хлюпкая восень. Я прыслухоўваюся да нуднай мелодыі няспынных балбатлівых кропляў.* (У. Клімовіч) *Тут пад мелодыю дажджу Дуброва ўжо адгаварыла.* (А. Салтук) **2**. ‘скрып дзвярэй’. *Знаёмую мелодыю звароту Прайграюць дзверы родныя мае.* (К. Камейша)

**Мова** ‘шум ветру, шопат лісця і іншыя прыродныя гукі’. *І вы тады расчыніце акно, І мова ветру будзе зразумета.* (Н. Мацяш) *Гай спявае песню на мове звыклай.* (П. Панчанка) *Над ім плыве галактык спеў, Як доктар, слухае ён [паэт] вечнасць, Каб перакласці мову дрэў На голас чалавечы.* (А. Пісьмянкоў) *Неўзабаве зноў загаворыць Зямля На зялёнай мове лістоў, поўнай шчырасці і даверу.* (Р. Барадулін) *Мовай неба далучаешся Зноў да раскошы незямной.* (Н. Мацяш) *Глушыць зямлю шум іх [хмар] мовы, І выконвае ім словы Гром выразней і мацней.* (Я. Колас)

**Найгрыш** ‘строкат коніка’. *Ну, вядома ж, я не мог праспаць... Гэты цвыркуновы найгрыш сольны...* (Н. Гілевіч)

**Накцюрн** ‘шум вады ў час паводкі’. *Сумуе снег, разрумзаўся лядок, а павадак зайграў накцюрн сустрэчы...* (Р. Баравікова)

**Напеў** ‘шум дрэў, ветру і пад.’ *З тых дзён, поўных чараў казкі, Пад напеў дарожных лоз, Стаў я песняром сялянскім Гэтых сцежак і бяроз.* (М. Танк) *Вялікі дуб, яго напевы Ідуць з карэньчыкаў малых.* (П. Броўка) *Толькі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*словы сказала, два словы — Пад напевы вясновай дубровы.* (А. Дзеружынскі) *Напеў ветраў асенніх*. (П. Трус) *Восень свае пачынае напевы*. (У. Дубоўка) *Ідуць смела і сурова Пад напеў пургі*. (Я. Колас)

**Нарада** ‘птушыны шчэбет, шум’. *Улучыўшы зручны момант, калі птушкі распачалі нараду, як лепей выжыць нахабных захопнікаў са свае хаткі, верабей вышмыргнуў са шпакоўні.* (І. Шуцько) *Птушкі вялі сур’ёзную нараду*. (А. Пальчэўскі) *Ластавак нарада. Залаты абсяг*. (Н. Мацяш)

**Нота** ‘частае і дробнае стуканне кропель дажджу’. *Колькі назойлівых нотаў Дождж паўтараў ачмурэла.* (І. Тарасава)

**Ода** ‘спеў салаўя’. *Салавей, канчай свае старыя оды...* (Г. Бураўкін)

**Перапалка** ‘сквірчэнне, патрэскванне на гарачай скаварадзе’. *Завядуць перапалку на прыпеку скваркі.* (Д. Бічэль-Загнетава)

**Плач 1**. ‘шум ветру, шэлест лісця на дрэвах’. *А вецер гудзе над табою Са смехам і плачам*. (К. Кірэенка) *Краю роднаму ламалі лёс пад плач бяроз...* (М. Віняцкі) *Нам гучыць той гімн нястомны... Местачковых вербаў плач.* (В. Куртаніч) *І восень сцюдзёная з ветрам і плачам*. (У. Дубоўка) *Мне так мілы буры, плач асенняй ночкі*. (Я. Колас) **2**. ‘гучанне аркестра’. *Ад плачу аркестра сціскалася сэрца*. (М. Гроднеў) **3.** ‘скрып палазоў’. *З паўнюткім вядром аснежаны досвітак грукае ў дом, ахутаны парай, атрос на парог і плач палазоў, і сувеі дарог.* (А. Вялюгін)

**Прычытанне** ‘шум, шапаценне дрэў’. *І раптам з адвечнага мора імглы завітвае вецер — сляпы чарнакніжнік — прычытаннем асіны і енкам пілы.* (В. Маракоў)

**Размова** ‘шум, гул (пра гукі прыроды)’. *І на павестку дня вясна Выносіць аб жыцці размову*. (П. Прануза) *Расціце ж, дубкі маладыя, расціце І з волжскаю хваляй Размову вядзіце.* (М. Нядзведскі) *Што мілей размовы збожжа На палёх у летні час?* (Я. Колас) *Трыснягі вядуць размову з вадой.* (І. Пракаповіч) *Шумяць бары, вядуць размову гоні.* (У. Клішэвіч) *Ракі патайныя размовы*. (А. Разанаў) *Над вёскай дымок гаркавы. Размова касы з атавай*. (А. Пісьмянкоў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Роздум** ‘ціхі шэпт дрэў, траў’. *Гавораць вяскоўцы: Дуб-волат стары У роздум глыбокі Запаў з той пары.* (Н. Гілевіч) *Пад неба ўзносяць журавы І пошум трапяткі бярозы, І дуба роздум векавы.* (М. Стральцоў) *Няхай жыве тут вечны роздум Бяроз шумлівых і калін.* (Л. Дайнека) *Люблю паслухаць роздум жытніх ніў*. (З. Марозаў)

**Рэквіем 1**. ‘шум ветру, шэлест дрэў’. *Уверсе шумелі, Спяваючы рэквіем, кроны, І конік зялёны Ля каскі на скрыпцы іграў*. (М. Арочка) *Зайграла восень рэквіем З ліста, Што павуцінку навісу трымае*. (У. Скарынкін) *Байцам спявае рэквіем сасоннік, Карэннем дол сплятаючы гусцей*. (А. Пысін) **2**. ‘гром’ *Хлапцам і слухаць некалі у ззянні бліскавіц той перуновы рэквіем, што на ўвесь свет гучыць*. (В. Макарэвіч) 3.’курлыканне’. *У просіні над вежамі, над рэкамі жураўліны рэквіем*. (А. Вялюгін)

**Рэчытатыў** ‘напеўнае гучанне чаго-небудзь’. *Палессе! Кожная лясная рэчка твая — драмлівы рэчытатыў ліры*. (У. Караткевіч)

**Сварка** ‘гучнае карканне, шчабятанне’. *На старой бярозе штосьці не падзялілі, усчапілі сварку вароны.* (І. Аношкін) *Чуецца ў шпакоўні сварка*. (М. Хведаровіч)

**Сола** ‘спеў птушкі’. *Чулася птушкі світальнай сола*. (В. Гардзей) *Чутны ледзь акорды кропляў, Хор свавольных ручаёў, Сола сакавіцкіх трэляў З цёплых шпак прынёс краёў.* (І. Лосік) *Начное сола майстра салаўя На золаку птушыны хор змяняе.* (П. Саковіч)

**Трызненне 1**. ‘шум, шэпт ветру, дрэў і пад.’ *Трызненне ветру і бярозы стогны і ўтрапёны позірк твой — у бездань, у нябыт*. (В. Слінко) *Трызненне світальнай пары*. (П. Панчанка) **2**.’шоргат паперы’. *І не трызненне мёртвай паперы, Што рассякаюць дні, А дзікім дэсантам старыя хімеры Рвуцца з далечыні*. (Р. Семашкевіч)

**Фантазія** ‘шум ветру’. *Пад сто фантазій сівера І пад дажджу авацыі Кахання вочы сінія Мяне ніякавацілі.* (В. Стрыжак)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ